Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар універсітэта
_____ Н. У. Карчэўская
30.12.2025 г.
Рэгістрацыйны № ВД-6/25-110 э/вуч.

АСНОВЫ КАМПАЗІЦЫІ

Вучэбная праграма установы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
6-05-0213-02 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва

2025

Вучэбная праграма складзена на падставе адукацыйнага стандарту агульнай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0213-02 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 21.08.2023 №270; вучэбнага плана па спецыяльнасці 6-05-0213-02 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва

СКЛАДАЛЬНІК

Л.А. Малахава, дацэнт кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

*Б.А. Лазука, з*агадчык аддзела старажытнабеларускай культуры дзяржаўнай навуковай установы "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры" Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

Н.В. Петухова, загадчык кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржауны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Кафедрай дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 от 24.11.2025);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 20.12.2025).

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Асновы кампазіцыі” з’яўляецца важнай часткай прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці 6-05-0213-02 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Вучэбная дысцыпліна “Асновы кампазіцыі” з'яуляецца першай часткай модуля “Кампазіцыя” і непасрэдна связана з вучэбнымі дысцыплінамі “Дэкаратыўная кампазіцыя” і “Кампазіцыя ў народнай творчасці”, а таксама з такімі дысцыплінамі як “Колеразнаўства”, “Мастацкае праектаванне”, “Асновы дызайна”.

Вучэбная праграма ўключае ў сябе заданні ў такім парадку, каб студэнты маглі найбольш поўна авалодаць сродкамі кампазіцыі, якія неабходны спецыялісту ў галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Асновай метаду навучання кампазіцыі з’яўляецца практычнае выкананне студэнтамі заданняў па азначаных тэмах. У залежнасці ад складанасці заданню адводзіцца адпаведная колькасць гадзін.

Асноўнай *мэтай* вучэбнай дысцыпліны з’яўляецца развіццё мастацкіх здольнасцей студэнтаў і фарміраванне эстэтычнага светапогляду сучаснага мастака на аснове асэнсавання, ужывання і трансфармавання нацыянальных традыцый у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве.

Праграма вучэбнай дысцыпліны прадугледжвае выкананне наступных *задач:*

– засваенне ведаў з гісторыі, тэорыі і методыкі прадмета;

– прафесійнае авалоданне асноўнымі сродкамі кампазіцыі;

– засваенне на практыцы асноўных кампазіцыйных пабудоў;

– авалоданне пластыкай для ўвасаблення мастацкай ідэі.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен:

ведаць:

– асноўныя тыпы кампазіцыі ў гістарычных стылях мастацтва Сярэднявечча, Адраджэння, Барока, Класіцызму;

– віды кампазіцыйных пабудоў ў пластычных мастацтвах;

– кампаненты кампазіцыйнай пабудовы;

– спецыфіку кампазіцыйных распрацовак у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве з улікам матэрыялу і тэхнікі стварэння твора;

умець:

– суадносіць фармальныя элементы кампазіцыі адпаведна традыцыйным акадэмічным патрабаванням;

– ствараць арыгінальныя распрацоўкі, заснаваныя на свабодных кампазіцыйных прыёмах, у адпаведнасці з пастаўленымі задачамі;

– вылучаць фармальны цэнтр і сілавыя лініі кампазіцыі;

– фарміраваць цэласнасць кампазіцыі ў творах выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва праз суладдзе фармальных і ідэйна-сэнсавых кампанентаў;

мець навык:

– валодання рознымі графічнымі тэхнікамі і асэнсавана ўжываць тэхнічныя навыкі на практыцы;

– стварэння франтальнай, аб'емнай і аб'емна-прасторавай кампазіцыі ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве.

Выкладанне вучэбнай дысцыпліны садзейнічае фарміраванню ў студэнтаў *спецыялізаванай кампетэнцыі*: Выкарыстоўваць веды аб узаемадзеянні складаных частак кампазіцыі і навыкі стварэння аб'ёмнай дэкаратыўнай формы пры праектаванні і выкананні твораў народнай творчасці і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

У межах навучальнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен не толькі набыць практычныя і тэарэтычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіваць свой каштоўнасна-асабовы духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыета і грамадзяніна, гатовага да актыўнага удзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным жыцці краіны.

У адпаведнасці з вучэбным планам на засваенне вучэбнай дысцыпліны «Асновы кампазіцыі» прадугледжана ўсяго 114 гадзін, у тым ліку аўдыторных – 70 гадзін: з іх 8 гадзін лекцый, 62 – практычных заняткаў.

Для студэнтаў завочнай формы атрымання адукацыі прадугледжана 114 гадзін, з якіх 18 гадзін аўдыторныя заняткі (з іх: лекцыі 2 гадзіны, практычныя заняткі –16 гадзін).

Рэкамендаваная форма бягучай атэстацыі – прагляд творчай работы. Рэкамендаваная форма прамежкавай атэстацыі – залік.

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 4 заліковыя адзінкі.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

Уводзіны

Мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны. Асноўныя паняцці. Прадмет вывучэння. Сувязь з іншымі дысцыплінамі агульнанавуковага і прафесійнага цыклаў. Формы работы на занятках. Заданні на самастойную работу. Задачы тэарэтычных і практычных заняткаў вучэбнай дысцыпліны.

Тэма 1. Паняцце кампазіцыі

Кампазіцыя як аснова стварэння мастацкага вобразу, сродак вырашэння мастацкай ідэі, мова мастацкага твора. Развіццё вобразнага кампазіцыйнага мыслення. Кампазіцыя фармальная, дэкаратыўная і станкавая (агульныя рысы і адрозненне, часткі і элементы кампазіцыі, кампазіцыйныя схемы). Асноўныя законы кампазіцыі.

Тэма 2. Выразныя сродкі кампазіцыі і метады іх выкарыстання ў мастацкай творчасці

Кропка, пляма, лінія, колер, фактура як сродкі мастацкай выразнасці. Элементы кампазіцыі. Сілавыя лініі кампазіцыі. Візуалізацыя мастацкай ідэі ў пластычны вобраз. Пластыка. Вобразная выразнасць. Стварэнне пар, пабудаваных на кантрасце. Рытмічнасць. Тон і колер. Маштаб, прапорцыі, форма. Пабудова модульных сістэм. Арнамент: класіфікацыйныя прызнакі, прызначэнне, змест. Сувязь арнамента з рознымі відамі мастацтва. Выразныя сродкі арнаментальнай кампазіцыі. Кампазіцыя дэкаратыўнага пано.

Практычныя заняткі

Заданне 2.1 Распрацоўка фармальных кампазіцый, пабудаваных на кантрасце

Кантраст: сіметрыя-асіметрыя, дынаміка-статыка, нюанс-кантраст. Практыкаванні выконваюцца на плоскасці з элементаў геаметрычнага характару. Матэрыялы: аркуш паперы фармату А2, туш, гуаш, ч/б.

Задача. На аснове прапанаваных заданняў засвоіць прынцыпы кампазіцыйных пабудоў. Умець суадносіць фармальныя элементы кампазіцыі: пляму і лінію, святло і цень, прапорцыі, масы, фактуры. Праявіць уменне выкарыстання графічных сродкаў. Разумець метады стварэння цэльнай, устойлівай, ураўнаважанай па масах кампазіцыі. Паказаць валоданне тэхнічнымі сродкамі працы з паперай.

Заданне 2.2 Распрацоўка плоскаснага геаметрычнага модульнага элемента

Састаўленне на падставе распрацаваных элементаў розных відаў кампазіцыйных пабудоў. Заданне выконваецца ў графічным варыянце Матэрыялы: аркуш паперы А2, туш, гуаш, ч/б, магчыма ўжыванне шэрага колеру.

Задача. Авалодаць сродкамі і прыёмамі двухмернай кампазіцыйнай пабудовы на падставе метрычнай адзінкі. Распрацаваць элемент з улікам магчымасцяў камбініравання і стварэння новых, якасна іншых структур. Разумець сродкі модульнага формаўтварэння. Засвоіць прынцып камбінаторнай арганізацыі твора на падставе модульнага элемента.

Заданне 2.3 Пабудова геаметрычнага арнаменту

Заданне выконваецца ў графічным варыянце. Матэрыялы: аркуш паперы фармату А2, туш, гуаш, акварэль; ч/б, магчыма ўжыванне градацый шэрага колеру.

Задача. Засвоіць метады кампазіцыйнай пабудовы арнаменту. Ведаць і ўмець прымяняць на практыцы розныя віды сіметрыі і рытму. Стварыць рэльеф з пластычна ўзаемазвязанымі, прапарцыянальна і маштабна вытрыманымі рытмічнымі чаргаваннямі высот і глыбінь.

Заданне 2.4 Дэкаратыўная кампазіцыя з выкарыстаннем элементаў невыяўленчага характару

Заданне выконваецца ў графічным варыянце. Матэрыялы: аркуш паперы фармату А1, туш, гуаш, акварэль, змешаная тэхніка; ч/б, магчыма ўжыванне градацый шэрага, а таксама аднаго ўмоўнага колеру.

Задача. Стварыць цэльную і выразную па стылістыцы і пластыцы, ураўнаважаную па масах і плямах, эстэтычна вытрыманую монакампазіцыю з яскрава выражаным кампазіцыйным цэнтрам і супадпарадкаваннем элементаў. Прадэманстраваць адзінства фармальных і ідэйна-сэнсавых кампанентаў кампазіцыі, здольнасць данясення вобразна-мастацкага зместу кампазіцыі праз абстрактную форму. Вытрымаць у кампазіцыі гарманічныя маштабныя і прапарцыянальныя суадносіны мас, элементаў, фактур, святлаценяў, высот і глыбінь. Выразна вылучыць кампазіцыйны цэнтр, супадпарадкаваць элементы кампазіцыі. Паказаць тэхнічнае валоданне прыёмамі працы з абраным для выканання задання матэрыялам.

Тэма 3. Стылізацыя формы як прыём стварэння кампазіцыі

Паняцце стылізацыі і яе роля ў пабудове дэкаратыўнай кампазіцыі. Мастацкі стыль як адзінства мастацкіх сродкаў і адзіная ідэйная праграма. Еднасць формы і зместу. Асноўныя задачы стылізацыі. Ступені стылізацыі. Стылізацыя і камбініраванне. Асаблівасці выявы чалавека у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Выкарыстанне стылізацыі ў дэкаратыўнай кампазіцыі.

Практычныя заняткі

Заданне 3.1 Стылізацыя прыродных форм (флора)

Заданне выконваецца ў графічным выглядзе. Матэрыялы: аркуш паперы фармату А1, туш, гуаш, акварэль.

Задача. Паказаць разуменне этапаў працы над стылізацыяй. Знайсці арыгінальныя вобразныя рашэнні на кожнай ступені стылізацыі. Распрацаваць варыянты дэкаратыўнага стылізаванага раслінага элемента для розных

матэрыялаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Прадэманстраваць здольнасць падпарадкавання натурнага матэрыялу матэрыялам ДПМ.

Заданне 3.2 Праект вырабу з раслінным арнаментам

Праект двухмернага вырабу дэкаратыўна-прыкладнога характару з раслінным арнаментам, створаным з выкарыстаннем распрацаванага ў папярэднім заданні элемента. Заданне выконваецца ў колеры ў графічным выглядзе (А2, гуаш, акварэль, туш) з улікам магчымасці выканання ў матэрыяле.

Задача. Прадэманстраваць здольнасць ўпарадкавання пластычных, танальных і сэнсавых сувязяў метрычных элементаў паміж сабой пры стварэнні арнаментальнай кампазіцыі, а таксама - адпаведнасць формы, зместу і месцазнаходжання арнаменту уласна форме і функцыі вырабу.

Заданне 3.3 Стылізацыя прадстаўнікоў фаўны

Заданне выконваецца ў графічным выглядзе. Матэрыялы: аркуш паперы фармату А1, туш, гуаш, акварэль.

Задача. Паказаць разуменне этапаў працы над стылізацыяй. Знайсці арыгінальна-вобразныя рашэнні на кожнай ступені стылізацыі. Распрацаваць варыянты дэкаратыўнага стылізаванага анімалістычнага элемента для розных матэрыялаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Прадэманстраваць здольнасць падпарадкавання натурнага матэрыялу матэрыялам ДПМ.

Заданне 3.4 Праект дэкаратыўнага пано

Заданне выконваецца у графічным варыянце (чарцёж: А2, туш).

Задача. Стварыць граматны эскіз вырабу з улікам матэрыялу дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, прадэманстраваць выразнае вобразна-пластычнае рашэнне, цэльнасць, ураўнаважанасць і адзінства кампазіцыі шляхам вылучэння кампазіцыйнага цэнтру і дасягнення гарманічнага спалучэння якасцяў формы (геаметрычнага выгляду, прапорцый, маштабу, супадпарадкавання элементаў, гарманічных суадносінаў фактуры, тэкстуры, колеру).

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Дзённая форма навучання

Назва раздзела, тэмы	Колькасць аўдыторных гадзін		Колькасць гадзін КСР	Форма кантроля ведаў
	Лекцыі	Практычныя заняткі		
Уводзіны	2			
Тэма 1. Паняцце кампазіцыі	2			
Тэма2. Выразныя сродкі кампазіцыі і метады іх выкарыстання ў мастацкай творчасці		2	2	рэферат
Заданне 2.1 Распрацоўка фармальных кампазіцый, пабудаваных на кантрасце		6	2	творчая праца
Заданне 2.2 Распрацоўка плоскаснага геаметрычнага модульнага элемента		6		
Заданне 2.3 Пабудова геаметрычнага арнаменту		6	2	творчая праца
Заданне 2.4 Дэкаратыўная кампазіцыя з выкарыстаннем элементаў невыяўленчага характару		6	2	творчая праца
Тэма 3. Стылізацыя формы як прыём стварэння кампазіцыі	2			
Заданне 3.1 Стылізацыя прыродных форм (флора)		4		
Заданне 3.2 Праект вырабу з раслінным арнаментам		6	2	творчая праца
Заданне 3.3 Стылізацыя прадстаўнікоў фаўны		6	2	творчая праца
Заданне 3.4 Праект дэкаратыўнага пано		8	2	праект
Усяго	**6**	**50**	**14**	

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Завочная форма навучання

Назва раздзела, тэмы	Колькасць аўдыторных гадзін		Колькасць гадзін для самастойнага вывучэння вучэбнага
	Лекцыі	Практычныя заняткі	
Уводзіны	2		4
Тэма 1. Паняцце кампазіцыі		2	8
Тэма2. Выразныя сродкі кампазіцыі і метады іх выкарыстання ў мастацкай творчасці		2	8
Заданне 2.1 Распрацоўка фармальных кампазіцый, пабудаваных на кантрасце		2	12
Заданне 2.2 Распрацоўка плоскаснага геаметрычнага модульнага элемента			12
Заданне 2.3 Пабудова геаметрычнага арнаменту			10
Заданне 2.4 Дэкаратыўная кампазіцыя з выкарыстаннем элементаў невыяўленчага характару			8
Тэма 3. Стылізацыя формы як прыём стварэння кампазіцыі		2	8
Заданне 3.1 Стылізацыя прыродных форм (флора)			8
Заданне 3.2 Праект вырабу з раслінным арнаментам			8
Заданне 3.3 Стылізацыя прадстаўнікоў фаўны			8
Заданне 3.4 Праект дэкаратыўнага пано		2	8
Усяго	**2**	**10**	**102**

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

Літаратура

Асноўная

1. Атрахович, Е.И. Композиция в дизайне: учебное пособие для студентов вузов по специальности «Дизайн» / Е. И. Атрахович. – Минск : Современные знания, 2009. – 187 с.

2. Беляев, М.В. Основы композиции : учебно-методическое пособие / М. В. Беляев. – Минск : [6. и.], 2002. 77, [1] с. : ил.

3. Кошаев, В.Б. Декоративно-прикладное искусство. Понятия. Этапы развития : учебное пособие для студентов вузов, обучающихся по специальности «Декоративно-прикладное искусство» / В. Б. Кошаев. – Москва : Владос, 2014. – 271, [1] с., [16] с. цв. фот.

4. Перелыгина, Л.Г. Перспектива : учебное пособие для студентов учреждений высшего образования по специальности «Живопись (по направлениям)», «Скульптура», «Монументально-декоративное искусство (по направлениям)», «Графика», «Дизайн (по направлениям)» / Л. Г. Перелыгина. – Минск : Вышэйшая школа, 2021. – 262, [1] с

Дадатковая

1. Сенько Д. С. Основы композиции и цветоведения / Д. С. Сенько. – Минск: Беларусь, 2010. – 184 с.

2. Пономарева, Е. С. Цвет в интерьере. – Минск : Вышэйшая школа, 1984. – 166, [1] с. : цв. фот.

3. Чернышов, О.В. Формальная композиция: творческий практикум / О.В. Чернышов. – Минск: Харвест, 1999. – 232 с.

4. Шорохов, Е.В. Композиция: учебное пособие / Е. В. Шорохов, Н. Е. Козлов. – М.: Просвещение, 1978. – 235 с.

Рэкамендаваныя метады навучання

Асноўны змест вучэбнай дысцыпліны “Асновы кампазіцыі” складаюць тэмы, якія паступова знаёмяць студэнтаў з метадамі стварэння розных відаў кампазіцыі: мастацкай арганізацыяй плоскасці, аб’ёма, прасторы, а таксама з выкарыстаннем і ўзаемадзеяннем розных пластычных і колеравых сродкаў. Акрамя таго, студэнты вывучаюць асаблівасці кампазіцыі, каларыту і стылізацыі ў народным мастацтве. Усе вучэбныя, творчыя і курсавыя праекты ў час навучання выконваюцца ў розных графічных тэхніках і з выкарыстаннем разнастайных тэхнічных сродкаў; на старэйшых курсах вялікая ўвага надаецца тэхніцы выканання праектаў, стылёваму адзінству, вобразнай і колеравай выразнасці кампазіцыі. Стварэнне цэласнай сістэмы ансамбля прадметнага асяроддзя з’яўляецца адным з важных напрамкаў творчай дзейнасці мастакоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Методыка навучання кампазіцыі прадугледжвае правядзенне розных відаў заняткаў: лекцыйныя гадзіны, практычныя заняткі, час на самастойную падрыхтоўку. У межах лекцыйных заняткаў курса студэнты знаёмяцца з асноўнымі тэарэтычнымі палажэннямі кампазіцыі. Цыкл практычных заняткаў прызначаны для замацавання атрыманых ведаў ў працэсе выканання шэрагу заданняў, парадак якіх пабудаваны па прынцыпу паступовага павелічэння складанасці.

Асноўным прынцыпам *тэхналогіі навучання* асновам кампазіцыі з’яўляецца паслядоўнасць і засваенне ведаў: ад тэарэтычнага разбору і асэнсавання пастаўленай задачы – праз паслядоўнае яе вырашэнне метадам эскізных пошукаў – да лагічнага завяршэння ў выглядзе чыставой падачы графічнай і аб’емна-пластычнай частак праекта.

Асноўнымі метадамі навучання асновам кампазіцыі з’яўляюцца:

– эмацыянальна-рацыянальны аналіз твораў сусветнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

– паэтапнасць выканання плоскасна-графічных і аб’ёмных варыянтаў вырашэння пастаўленых задач;

– выкарыстанне індывідуальных і калектыўных форм працы, абмеркаванне вынікаў аўдыторных і самастойных заданняў.

Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананню самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў накіравана на ўзбагачэнне іх ведаў, уменняў і навыкаў па вучэбнай дысцыпліне “Асновы кампазіцыі”. Мэта самастойнай работы студэнтаў – садзейнічанне засваенню ў поўным аб’ёме зместу вучэбнай дысцыпліны праз сістэматызацыю, планаванне і кантроль.

Паралельна з практычнымі заняткамі праграмай прадугледжана выкананне шэрагу самастойных заданняў, якія прызначаны ў дапамогу засваенню вучэбнага матэрыялу.

Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для кантролю за авалоданнем студэнтамі вучэбнага матэрыялу выкарыстоўваюцца

– метады вуснай дыягностыкі ведаў (рэферат, залік);

– метады практычнай дыягностыкі (прагляд вучэбных работ, правядзенне самастойнай работы, творчая дзейнасць).

Сфармуляваныя для кожнага задания задачы адначасова з’яуляюцца і асноўнымі *крытэрыямі ацэнкі* вучэбных твораў на кантрольных (бягучых і выніковых) праглядах. Бягучы кантроль выканання аудыторных і самастойных заданняў здзяйсняе непасрэдна педагог. Аптымальнай формай правядзення выніковых (заліковых і экзаменацыйных) праглядау з’яуляецца абмеркаванне і ацэнка студэнцкіх работ камісіяй у складзе педагогаў кафедры дэкаратыуна-прыкладнога мастацтва.